# МУЗЕЯЗНАЎСТВА



**Бяспалая Марыя Аркадзьеўна**
Доктар гістарычных навук,
прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі
і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта культуры і мастацтваў

УДК 378.09:[94(476)+069](091)(476-25)

*М. А. Бяспалая*

## Статус кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства: заканамернасці трансфармацыі

*Разглядаюцца заканамерныя шляхі развіцця і працэсы трансфармацыі кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.*

*Аўтарам даецца ўсебаковы аналіз дзейнасці кафедры за 45 гадоў ад пачатку яе існавання. Эмпірычную аснову склалі архіўныя дакументы, публікацыі супрацоўнікаў, змешчаныя ў навуковых зборніках, і інш.*

У сярэдзіне 70-х гг. XX ст. сітуацыя ў СССР у пэўнай ступені вызначалася з'яўленнем новых, больш цывілізаваных патрабаванняў да сацыякультурнай сферы. Праяўляліся тэндэнцыі, накіраваныя на вывучэнне, захаванне і папулярызацыю адметнай гістарычнай і культурнай спадчыны, народных звычаяў, традыцый, музычнага фальклору, фарміраванне ўяўлення аб самабытнасці і непаўторнасці беларускай культуры і інш. Выконваць гэтыя задачы было не пад сілу двум факультэтам, якія мелі дачыненне да сферы культуры – бібліятэчнай і культурна-асветнай работы, тым больш, што яны працавалі ў розных устано-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вах вышэйшай адукацыі. Стварэнне Мінскага інстытута культуры было з'явай лагічнай і своечасовай, таму што ён вырашаў адну з галоўных задач – падрыхтоўку кадраў для сферы культуры.

З першых дзён дзейнасці кафедры гісторыі СССР, БССР і замежных краін яе статус вызначыўся як агульнаінстытуцкі. Яна ўваходзіла ў структуру, якую ўтваралі кафедры гісторыі КПСС, навуковага камунізму, палітэканоміі і марксісцка-ленінскай філасофіі. Гэты статус абгрунтоўваўся выкладаннем гісторыі СССР, якая разглядалася як грамадская дысцыпліна. Яе выкладчыкі і калегі з другіх агульнаінстытуцкіх кафедр мелі вучэбную нагрузку 560 гадзін у год, у адрозненне ад педагогаў спецыяльных кафедр, у тым ліку гісторыі БССР і замежных краін, нагрузка якіх складала 720–780 гадзін у год, што адбівалася на якасці адукацыі, выхаваўчай работы.

Арганізацыйна-метадычнае забеспячэнне агульнаінстытуцкіх кафедр было цэнтралізаваным і таму стандартным. Міністэрствам адукацыі вызначаліся колькасць гадзін, адведзеных на пэўную дысцыпліну, форма кантролю, «спушчаныя» распрацаваныя і зацверджаныя праграмы. Ад выкладчыкаў агульнаінстытуцкіх кафедр, акрамя выканання заданняў асноўнага вучэбнага працэсу, патрабаваўся актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці ВНУ, раёна, горада. Напрыклад, першы і нязменны на працягу сарака гадоў загадчык кафедры гісторыі СССР, БССР і замежных краін А. П. Грыцкевіч у канцы 1970-х гг. узначальваў партыйны камітэт інстытута.



Аднак не толькі агульнаінстытуцкі статус кафедры вызначаў яе аўтарытэт, на гэта працавалі навуковыя дасягненні яе выкладчыкаў. Шырока, нават за межамі рэспублікі былі вядомы даследаванні А. П. Грыцкевіча [2] па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, У. С. Пасэ [4]

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па гісторыі партызанскага і падпольнага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны і інш.

На працягу 1980-х гг. навуковы калектыў кафедры распрацоўваў дзве тэмы: у першыя пяць гадоў – «Культурна-асветніцкая дзейнасць у беларускіх губернях у другой палове XIX ст.», у наступныя – «Культурна-асветніцкая дзейнасць у беларускіх губернях у канцы XIX – пачатку XX ст.». У выніку скрупулёзнай працы з архіўнымі і тагачаснымі друкаванымі матэрыяламі, аналізу эмпірычнага матэрыялу навуковы калектыў кафедры прыйшоў да цікавых высноў, якія не згубілі сваёй актуальнасці і ў цяперашні час. Былі вылучаныя і прааналізаваныя формы культурна-асветніцкай дзейнасці ў 1861–1917 гг., якія, безумоўна, у многім адпавядаюць і сучасным: публічныя лекцыі, народныя чытанні, музычныя і харавыя канцэрты, тэатральныя спектаклі, літаратурна-музычныя вечары, мастацкія выстаўкі і г. д. Непасрэдна праз публікацыі ў навуковы зварот была ўведзена значная колькасць новага фактaлагічнага матэрыялу, зроблены высновы аб пераемнасці форм і метадаў культурна-асветніцкай дзейнасці.

Навуковы патэнцыял кафедры аказаўся запатрабаваны і ў другім ракурсе: падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў межах рэспублікі, асабліва па навуковай спецыяльнасці 07.00.03 Усеагульная гісторыя. Кафедры, на якіх ажыццяўлялася выкладанне гэтай дысцыпліны, існавалі на гістарычных факультэтах БДУ і педінстытута, кола спецыялістаў было дастаткова вузкім для паўнавартаснай экспертызы дысертацый. Таму існаванне кафедры гісторыі СССР, БССР і замежных краін, дзе выкладанне забяспечваў спецыяліст у гэтай гістарычнай галіне, дазваляла выкарыстоўваць яе ў якасці апаніруючай арганізацыі, а выкладчыка М. А. Бяспалую ў якасці апанента. Гэты кірунак навуковых кантактаў актыўна развіваецца і ў наш час. На кафедры працуюць спецыялісты ў галіне архівазнаўства і дакументазнаўства, этналогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, якія актыўна ўдзельнічаюць у экспертызе дысертацый.

Кардынальныя перамены ў палітычным, эканамічным, сацыякультурным развіцці СССР у другой палове 1980-х гг. абумовілі адпаведныя змены ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў БССР. Разгортванне нацыянальнага руху выклікала зацікаўленасць у вывучэнні роднай гісторыі, пераход да яе выкладання на беларускай мове. У новых сацыяпалітычных умовах кафедра была перайменавана ў кафедру гісторыі Беларусі (выкладанне айчыннай гісторыі адбывалася на беларускай мове). Увогуле яе статус з агульнаўніверсітэцкай (з 1994) быў падняты да культура- і навукатворчай, а прафесарска-выкладчыцкі састаў прыклаў нямала намаганняў да вырашэння праблемных пытанняў айчыннай гісторыі. Дзякуючы цвёрдай пазіцыі загадчыка кафедры, доктара гістарычных навук, прафесара А. П. Грыцкевіча, навуковая супольнасць прызнала Вялікае Княства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літоўскае беларуска-літоўскай дзяржавай. Гэты пункт гледжання стаў асновай айчыннай гістарычнай навукі[1].

У пачатку 1990-х гг., на наш погляд, надзвычай актуальнай стала роля айчыннай гісторыі ў фарміраванні ідэй беларускай дзяржаўнасці, самабытнасці беларускай культуры, адзінага і непаўторнага гістарычнага мінулага. Выкладчыкі кафедры ўсведамлялі значэнне трансляцыі гістарычных ведаў студэнтам універсітэта, рэальна падтрымліваючы думку аднаго з французскіх навукоўцаў, што толькі добры падручнік гісторыі стварае нацыю. Да нашай сітуацыі больш падыходзіць замена слова «падручнік» на «веды», таму што глыбокае веданне гісторыі свайго народа ўмацоўвае яго адзінства.

Трансфармацыя сістэмы адукацыі ў суверэннай Беларусі з улікам яе надзённых патрэб, з апорай на гісторыка-культурны вопыт вымагала распрацоўкі адпаведных вучэбных планаў, якія ўлічвалі б і неабходнасць вывучэння гісторыі Беларусі. У гэтым сэнсе праблемы існавалі, вонкава яны адбыліся ў тым, што па аб'ектыўных прычынах некаторы час кафедра была аб'яднана з кафедрай філасофіі.

Сітуацыя кардынальна змянілася ў канцы 1990-х гг., калі на кафедру была перададзена спецыяльнасць «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» і ў назве кафедры спалучыліся абодва кірункі дзейнасці – выкладанне прадмета «Гісторыя Беларусі» на ўсіх факультэтах і музеязнаўчых дысцыплін для студэнтаў спецыяльнасці. Статус кафедры таксама набыў здвоенае значэнне: з аднаго боку, яна засталася агульнаўніверсітэцкай, з другога – ператварылася ў выпускаючую. Спалучэнне гэтых кірункаў патрабуе ад калектыву пастаяннага пошуку новых метадычных падыходаў да выкладання вучэбных дысцыплін. Калі форма і змест выкладання гісторыі Беларусі вызначаецца Міністэрствам адукацыі, то ў выпрацоўцы задач і зместу падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музеязнаўства кафедра арыентуецца на вучэбныя планы і стандарты, распрацаваныя на гістарычным факультэце БДУ. Гэтая акалічнасць пэўным чынам стрымлівае ініцыятыву кафедры, якая мае магчымасць уносіць свае прапановы толькі ў курсы па выбары студэнта.

Нельга сказаць, што калектыў аб'яднанай кафедры змог адразу вызначыць галоўную мэту падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музеязнаўства. З цягам часу стала відавочнай задача ўсебаковага вывучэння гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі і розных варыянтаў яе музеефікацыі як галоўнага метаду захавання. У перспектыве, спадзяюся, калектыў кафедры будзе праводзіць ідэю, што *гісторыка-культурная спадчына – гэта не сума помнікаў гісторыі і артэфактаў культуры, а адна з форм культуры*.

[1] У 2019 г. кафедрай была праведзена навуковая канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння А. П. Грыцкевіча [1].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выпускнікі кафедры надзвычай запатрабаваныя ва ўстановах сферы культуры. Яны працуюць дырэктарамі краязнаўчых музеяў, галоўнымі захавальнікамі фондаў, загадчыкамі аддзелаў, навуковымі супрацоўнікамі. Дзякуючы наладжаным цесным сувязям з Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, іншымі сталічнымі і рэгіянальнымі музеямі трэць выпускнікоў кафедры пасля размеркавання становяцца навуковымі супрацоўнікамі музейных устаноў.



Кафедра не стаіць на месцы, а актыўна распрацоўвае сучасныя падыходы да арганізацыі і методыкі навучання, да пошуку новых кірункаў спецыяльнасці. З 2012/13 навучальнага года ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў па кірунку «культурная спадчына і турызм». Новы напрамак у адукацыйнай дзейнасці патрабаваў шмат высілкаў па напаўненні вучэбнага плана спецыяльнымі курсамі па выбары, арганізацыі азнаямленчай і вытворчай практыкі і гэтак далей. У гэтым ракурсе кафедра звярнулася і да міжнароднага вопыту. Напрыклад, у 2015 г. (Мінск) праходзіў сумесны семінар кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства з выкладчыкамі Брандэнбургскага тэхналагічнага ўніверсітэта (г. Котбус, Германія).

Пасля аб'яднання і спалучэння на кафедры выкладання гісторыі і музеязнаўчых дысцыплін, навуковая дзейнасць калектыву скіравалася на даследаванне гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Навуковыя кірункі даследавання гэтай праблемы ўключаюць вывучэнне тэарэтыка-метадалагічных асноў музея як сацыякультурнага інстытута, гістарыяграфічную і крыніцазнаўчую складаючую, вызначэнне месца гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ў сусветнай культурнай прасторы і інш.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

Вынікам даследчай працы па гэтых кірунках з'яўляюцца шматлікія публікацыі выкладчыкаў кафедры ў айчынных і замежных выданнях. Яны ахопліваюць праблемы вывучэння, захавання і трансляцыі этнаграфічных, нумізматычных, дакументальных, выяўленчых музейных калекцый. Прычым, дзякуючы публікацыям, у навуковы зварот упершыню ўведзена шмат матэрыялаў, якія захоўваюцца ў фондах музеяў. Да іх можна аднесці дакументы аб дзейнасці Мінскага таварыства аматараў прыродазнаўства, археалогіі і этнаграфіі з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, аб дзейнасці Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта з фондаў Дзяржаўнага музея Янкі Купалы, шмат цікавых і малавядомых дакументаў, якія захоўваюцца ў рэгіянальных музеях.

Навуковыя інтарэсы выкладчыкаў кафедры ахопліваюць розныя галіны гістарычных ведаў: у праблемным полі гісторыі Беларусі працуе загадчык кафедры, доктар гістарычных навук, прафесар М. А. Бяспалая, у галіне нумізматыкі – кандыдат гістарычных навук, дацэнт І. Н. Колабава, этнаграфіі – кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. М. Нароўская, па крыніцазнаўчай праблематыцы – А. Я. Паўлава. У разрэзе музеязнаўчай тэматыкі працуюць кандыдаты культуралогіі Я. Л. Іванова, І. Г. Лупашка, Д. В. Герасімёнак, старшы выкладчык І. І. Бамбешка. Плённа працуюць над доктарскімі дысертацыямі ў галіне гістарыяграфіі новай і найноўшай гісторыі Л. У. Ландзіна, у галіне айчыннай археалогіі А. А. Трусаў. Творчыя пошукі выкладчыкаў у галіне музейнай педагогікі, экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці і інш. знаходзяць увасабленне ў манаграфіях, навукова-папулярных выданнях, сумесных даследаваннях і выданнях з іншымі ўстановамі. Так, А. М. Нароўская з'яўляецца аўтарам раздзела «Інтэр'ер традыцыйнага народнага жылля» ў шматтомнай калектыўнай манаграфіі [3].




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку цеснага супрацоўніцтва кафедры з Нацыянальнай акадэміяй навук штогод пад патранажам Інстытута гісторыі праводзіцца археалагічная практыка студэнтаў (у форме раскопак на гарадзішчы старажытнага Мінска), якой кіруе выпускнік кафедры, кандыдат гістарычных навук А. В. Вайцэховіч. Азнаямленчая практыка студэнтаў 2-га курса заўсёды праходзіць у навукова-даследчым цэнтры «Музей старажытнай беларускай культуры» Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі.







Супрацоўніцтва ў навуковай галіне з рэгіянальнымі музеямі адлюстроўваецца ў сумесным правядзенні Тышкевіцкіх чытанняў, геаграфія якіх дастаткова шырокая, пачынаючы з 2007 г. іх праведзена сем: спачатку на базе ўніверсітэта, потым у Лагойску, Вілейцы, Валожыне і г. Крэцінга (Літва), Свіслачы (Гродзенская вобласць), Барысаве. Разам з рэгіянальнымі музеямі праводзяцца навукова-практычныя канферэнцыі і круглыя сталы. Выкладчыкі кафедры прымаюць актыўны ўдзел у навуковых канферэнцыях музейнай тэматыкі ў музеях Віцебска, Маладзечна, Веткі, Мінска, Полацка і інш.

Самым важным дасягненнем кафедры з пункту гледжання развіцця музеязнаўчай навукі ў Беларусі з'яўляецца абарона пяці кандыдацкіх дысертацый Т. А. Джумантаевай, Я. Л. Івановай, І. Г. Лупашка, Я. А. Кавалёвым і Д. В. Герасімёнкам з прысваеннем ім навуковай ступені кандыдата культуралогіі. У сувязі з гэтым можна ўпэўнена сцвярджаць аб фарміраванні ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў навуковай школы ў галіне музеязнаўства. У юбілейным годзе кафедра плануе абарону яшчэ трох кандыдацкіх дысертацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, можна канстатаваць, што статус кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства на працягу ўсяго перыяду яе існавання, нягледзячы на структурныя перамены, заставаўся нязменна высокім. Гэтаму садзейнічала змястоўнае напаўненне і методыка выкладання вучэбных дысцыплін, што эвалюцыяніравалі адпаведна перамен у сацыяльна-палітычнай і сацыякультурнай сферах краіны. Калектыў кафедры змог упісацца ў працэс перабудовы сістэмы вышэйшай адукацыі, захаваць напрацаваны вопыт выкладання гістарычных і музеязнаўчых дысцыплін, прыстасаваць яго да профілю ўніверсітэта і пацвердзіць свой статус у структуры ўніверсітэта. Актыўная навукова-даследчая дзейнасць, развіццё культурных сувязей і супрацоўніцтва кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства з музеямі Рэспублікі Беларусь усіх катэгорый, з профільнымі ўстановамі НАН Беларусі і навучальнымі ўстановамі працуе на аўтарытэт усяго ўніверсітэта.

1. *Бяспалая, М. А.* Спадчына Анатоля Пятровіча Грыцкевіча праз прызму часу : [да 90-гадовага юбілею вядомага беларускага гісторыка, доктара гістарычных навук, прафесара А. П. Грыцкевіча (1925–2015)] / М. А. Бяспалая // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2019. – № 1 (31). – С. 121–124.

2. *Грицкевич, А. П.* Распределение магнатских и шляхетских владений в Белоруссии по их величине и этнической принадлежности владельцев (XVI в.) / А. П. Грицкевич // Вопросы истории : межвед. сб. – Вып. 5. – Минск, 1978. – С. 94–105; *Яго ж.* Беларуская шляхта / А. П. Грыцкевіч // Спадчына. – 1993. – № 1. – С. 11–16.

3. *Нароўская, А. М.* Інтэр'ер традыцыйнага народнага жылля / А. М. Нароўская // Нарысы гісторыі культуры Беларусі : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы. – Мінск, 2015. – Т. 3, кн. 1. – С. 116–195.

4. *Поссе, В. С.* Рейды партизанских сил Белоруссии в годы Великой Отечественной войны : (Материал в помощь лектору) / В. С. Поссе. – Минск : [Б. и.], 1975. – 19 с.

*M. Byaspalaya*

**Status of the department of history of Belarus and museum studies: patterns of transformation**

*The logical ways of development and transformation processes of the department of history of Belarus and museum studies of the Belarusian State University of Culture and Arts are considered.*

*A comprehensive analysis of the department within 45 years since its foundation is given by the author. The empirical basis is made up of archival documents, employees' publications in scientific collections, and etc.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 26.05.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ